## Білет 17

**Практычнае заданне.**

**Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Удзел БССР у стварэнні СССР. Узбуйненне тэрыторыі БССР.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Калі было абвешчана ўтварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ)?
2. Калі і кім было прынята рашэнне аб уваходжанні ССРБ у склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік?
3. Чаму беларуская дзяржава называлася савецкай? Свой адказ пацвердзіце цытатай з прадстаўленых матэрыялаў.
4. Ахарактарызуйце працэс фарміравання тэрыторыі БССР у 1921–1926 гадах. Якія гістарычныя падзеі паўплывалі на гэты працэс?

**I. З Маніфеста Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі** *(1 студзеня 1919 г.)*

Таварышы і браты працоўныя, бедныя сяляне і чырвонаармейцы Беларусі!

… Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Расіі… заклала падмурак новага ўкладу жыцця з уладай працоўнага народа. Пачаўшыся з Расіі, яна запаліла таксама агонь сусветнага вызвалення працоўнага народа ад эксплуатацыі…

… Сярод працоўных народаў Расіі, Літвы, Украіны і Латвіі з сягонняшняга дня становіцеся і вы свабоднымі і паўнапраўнымі гаспадарамі свабоднай незалежнай Беларускай сацыялістычнай рэспублікі. З сягонняшняга дня Беларусь – Савецкая Рэспубліка – становіцца рэспублікай працоўнага народа, рабочых, сялянскай беднаты, чырвонаармейцаў Беларусі.

Часовы Рабоча-сялянскі ўрад ... абвяшчае ўсяму свету: з гэтага моманту ўся ўлада ў Беларусі належыць толькі Саветам рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.

Уся зямля памешчыкаў і буйных землеўладальнікаў, манастыроў, цэркваў, касцёлаў, духавенства, з усім інвентаром, а таксама ўсе лясы, воды, нетры зямлі становяцца здабыткам працоўнага народа Беларусі….

**II. З пастановы IV Усебеларускага з'езда Саветаў аб стварэнні СССР** *(18 снежня 1922 г.)*

…Чацвёрты Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў лічыць, што прапанова Усеўкраінскага з'езда Саветаў аб неадкладным афармленні ўжо фактычна існуючага Саюза Савецкіх Рэспублік, аб'ядноўваючы супраць адзінага фронту сусветнага капіталу сілы рабочых і сялян усіх савецкіх рэспублік на асновах узаемнай роўнасці, цеснай палітычнай і гаспадарчай сувязі, у той жа час забяспечваючы самастойнае нацыянальна-культурнае будаўніцтва і ствараючы неабходныя гарантыі для праяўлення гаспадарчай ініцыятывы кожнага з членаў, адпавядае жыццёвым

інтарэсам Савецкай Беларусі і таму павінна атрымаць больш хуткае ажыццяўленне на маючым адбыцца з'ездзе ўсіх савецкіх рэспублік.

IV з'езд Саветаў Беларусі выказвае сваю глыбокую ўпэўненасць, што з'езд РСФСР сумесна з прадстаўнікамі Украіны, Беларусі і Закаўказскіх рэспублік створыць адзіны, моцна згуртаваны саюз працоўных усіх брацкіх рэспублік, даручае сваёй дэлегацыі, якая выбіраецца для ўдзелу на Усерасійскім з'ездзе Саветаў, даць падчас працы з’езда ўрачыстае абяцанне і здзейсніць фармальныя акты, якія замацуюць брацкі Саюз Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік».

**III. Картасхема. Тэрыторыя БССР у 1921–1939 гг.**

